ПРАВАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# Справаздача пра сітуацыю з ЛГБТК+ супольнасцю ў Беларусі



2024

# ЗМЕСТ


Галоўныя высновы ..... 4
Агляд апошніх падзеяў ..... 5
Аналіз Пастановы №18 ..... 6
Прыклады рэпрэсій за апошні час ..... 10
Рэпрэсіі ў дачыненні да транс-супольнасці ..... 11
Стан ЛГБТК+ супольнасці, заснаваны на дадзеных ад прадстаўнікоў і прадстаўніц профільных арганізацый ..... 14
Уплыў расійскай прапаганды на ЛГБТК+ супольнасць у Беларусі ..... 17
Псіхалагічны стан ЛГБТК+ супольнасці пасля 2020 года ..... 17
Напрыканцы ..... 19

Справаздача падрыхтаваная на падставе дадзеных ад TG-House і праваабарончых ЛГБТК+ арганізацый, якія працуюць у Беларусі. У ёй будуць прысутнічаць некарэктныя тэрміны ў выглядзе цытатаў са спасылкамі на першакрыніцы.

Справаздача прысвечаная аналізу сітуацыі з правамі ЛГБТК+ супольнасці ў кантэксце нядаўніх зменаў у заканадаўстве, узмоцненай стыгматызацыі на дзяржаўным узроўні, а таксама актыўным праваўжываннем. Мэтай справаздачы з'яўляецца выяўленне асноўных парушэнняў правоў чалавека, звязаных з дыскрымінацыяй па прыкметах сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці, а таксама разгляд наступстваў такіх захадаў для прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі.

# Галоўныя высновы

З праведзенага аналізу вынікае, што цяперашнія заканадаўчыя змены спрыяюць росту сацыяльнай стыгмы, легітымізацыі гвалту і парушаюць фундаментальныя правы чалавека, у тым ліку правы на роўнасць, свабоду ад дыскрымінацыі і асабістую бяспеку. Справаздача таксама разглядае шматлікія выпадкі парушэнняў правоў чалавека, што пацвярджае наўмысную палітыку ўладаў па прыцісненні ЛГБТК+ супольнасці.

Раней Прававая ініцыятыва сумесна з Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі рыхтавалі справаздачу па катаваннях з боку рэжыму ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці[1]. У дакуменце адзначаецца рост гамафобных настрояў на дзяржаўным узроўні, якія ўзмацняюцца з 2010 года. Таксама ў справаздачы прыводзяцца сведчанні пра катаванні і жорсткае абыходжанне ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, уключаючы фізічны і псіхалагічны гвалт падчас затрыманняў, а таксама выкарыстанне ў прапагандысцкіх мэтах прыналежнасці да ЛГБТК+ як негатыўную з'яву. Таксама адзначаецца, што пасля 2021 года, калі ў краіне былі ліквідаваныя практычна ўсе незалежныя ЛГБТК+ арганізацыі, супольнасць пазбавілася магчымасцяў

1 Справаздача Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі ў суаўтарстве з Прававой ініцыятывай. На аснове дадзеных, сабраных Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі і ПЦ «Вясна». – https://torturesbelarus2020.org/katavanni-lyudzej-lgbtk-i-gamafobnaya-palityka-rezhymu/

для абароны сваіх правоў і стала яшчэ больш безабароннай перад гамафобнай палітыкай рэжыму.

За верасень 2024 года ў Беларусі затрымалі ад 15 да 20 прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці. Вядома пра затрыманне 8 трансперсонаў: на большасць з іх былі сфальсіфікаваныя адміністрацыйныя пратаколы за «хуліганства», у дачыненні да двух завялі крымінальную справу па артыкуле 343 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — за «выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару»[2]. Дадзены артыкул выкарыстоўваецца як метад пераследу ЛГБТК+.

Дадзеная справаздача мусіць прыцягнуць увагу да сітуацыі ўнутры краіны з ЛГБТК+ супольнасцю, а таксама паказаць новыя рэпрэсіўныя інструменты рэжыму, якія выкарыстоўваюцца для пераследу і дыскрымінацыі людзей.

## Агляд апошніх падзеяў

У сакавіку 2023 года Аляксандр Лукашэнка ў сваім штогадовым пасланні заявіў пра неабходнасць спыняць любыя ідэі, якія, на яго думку, «абязлюджваюць» краіну. У тым ліку ён меў на ўвазе папулярызацыю бяздзетнага ладу жыцця і «нетрадыцыйных адносінаў»[3].

Летам 2023 года Генпракуратура Беларусі прапанавала ўвесці пакаранне за прапаганду «нетрадыцыйных адносінаў», чайлдфры і педафіліі[4]. У прыватнасці, ведамства ініцыявала папраўкі, якія ставяць у адзін шэраг «прапаганду нетрадыцыйных сексуальных адносінаў, змену полу, педафілію і чайлдфры».

Ужо ў сакавіку 2024 года былі ўнесеныя папраўкі ў заканадаўства — пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 8 траўня 2007 г. No 18 *«Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку выпуску, тыражавання, паказу, пракату, продажу і рэкламавання эратычнай прадукцыі, прадукцыі, што змяшчае элементы эротыкі, гвалту і жорсткасці, прадукцыі па*

2 https://www.svaboda.org/a/33136292.html

3 «Першае. Заходняя мода на чайлдфры. Любая папулярызацыя ідэяў бяздзетнай сямейнай пары ў нашай інфармацыйнай, культурнай прасторы павінна спыняцца! Любыя ўкіды такіх завуаляваных заклікаў, роўна як і ўсе нетрадыцыйныя павевы, – не што іншае, як спроба абязлюдзіць і аслабіць дзяржаву. Ніяк не менш! Такая ідэалогія павінна быць па-за законам! Другое. Мы вырасцілі дзяцей, якія ні ў чым не мелі патрэбу, і зараз яны хочуць як мага даўжэй пажыць для сябе, адкладаючы нараджэнне дзіцяці. Не ўсе, але тэндэнцыя ёсць. Яна небяспечная. Парадыгму такога мыслення трэба мяняць… Таму ў першую чаргу сродкі масавай інфармацыі, кінавытворчасць (Госпадзе, дзе яна, гэтая кінавытворчасць?..), культурніцкія праекты, рэкламная прадукцыя павінны працаваць на ідэю адраджэння традыцый вялікай, дружнай, поўнай, КЛАСІЧНАЙ сям'і» – https://president.gov.by/ru/events/poslanie-aleksandra-lukashenko-belorusskomu-narodu-i-nacionalnomu-sobraniyu-sostoitsya-31-marta

4 https://www.currenttime.tv/a/belarus-kastraziya-pedofilov/32465842.html

*сексуальнай адукацыі і палавым выхаванні, а таксама прадукцыі сексуальнага прызначэння і прызнанні страчанай сілы пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 13 красавіка 2000 г. No 8п»* (далей — Пастанова №18). Дадзены дакумент узмацняе цэнзуру і кантроль за распаўсюджванне інфармацыі на тэму ЛГБТК+ і сексуальнай адукацыі. Міністэрства культуры прыраўняла дэманстрацыю «нетрадыцыйных палавых адносінаў» да парнаграфіі, фактычна забараніўшы любое абмеркаванне ЛГБТК+ пытанняў у станоўчым або нейтральным ключы. Гэтыя змены суправаджаюцца масавай кампаніяй рэжыму, накіраванай на дыскрэдытацыю гендарнай разнастайнасці і чайлдфры, якія разглядаюцца як пагроза нацыянальнай бяспецы і дэмаграфічнай палітыцы краіны[5].

## Аналіз Пастановы №18

Змены ў Пастанову нумар 18 былі накіраваныя на ўнясенне новай тэрміналогіі ў прававую сістэму («нетрадыцыйныя палавыя адносіны»), а таксама прысваенне гэтаму тэрміну значэння «парнаграфія».

Так, згодна з абз. 3 п. 2 Пастановы №18, *«нетрадыцыйныя палавыя адносіны і (або) палавыя паводзіны — палавыя адносіны паміж людзьмі аднаго полу (гомасексуалізм, лесбійскае каханне), аднаго чалавека з людзьмі розных палоў (бісексуальныя адносіны), аднаго чалавека адначасова з некалькімі людзьмі аднаго або розных палоў (поліаморыя), паміж людзьмі, адзін з якіх не дасягнуў узросту 18 гадоў (педафілія), паміж чалавекам і жывёлай (заафілія), паміж чалавекам і трупам чалавека, жывёлы (некрафілія), а таксама палавыя паводзіны, пры якіх палавое задавальненне дасягаецца шляхам пазбаўлення рухомасці, нанясення болю і знявагі партнёру (садызм), перажыванні болю ад партнёра (мазахізм), падглядванні за аголенымі людзьмі і (або) людзьмі, якія ўступілі ў сексуалізаваныя адносіны (вуаерызм), паўторная ці ўстойлівая тэндэнцыя паказваць свае палавыя органы староннім асобам (звычайна супрацьлеглага полу) ці людзям у грамадскіх месцах без намеру ўступіць у блізкі кантакт (эксгібіцыянізм), надзяванне адзення процілеглага полу галоўным чынам для таго, каб дамагчыся палавога ўзбуджэння і выклікаць вобраз індывіда процілеглага полу (фетышысцкі трансвестызм), жаданне жыць і ўспрымацца атачальнымі як асоба процілеглага полу, што звычайна суправаджаецца адчуваннем дыскамфорту ад свайго анатамічнага полу ці пачуццём недарэчнасці сваёй палавой прыналежнасці (транссексуалізм)»*[6].

5 https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441365
6 Абзац уведзены пастановай Мінкультуры ад 19.03.2024 N 24 – https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441365

Такім чынам, заканадавец усталяваў, што гомасексуальнасць прыраўняная да педафіліі[7], заафіліі[8], некрафіліі[9] — то бок да злачынстваў. З гэтага можна зрабіць выснову, што негетэрасексуальныя адносіны паміж людзьмі па добраахвотнай згодзе рэжым успрымае таксама як злачынства, падкрэсліваючы тэрмінам «нетрадыцыйныя палавыя адносіны». Гэта спрыяе ўзмацненню сацыяльнай стыгмы і, як вынік, легітымізацыі гвалту ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці.

Дадзеная рыторыка парушае асноўныя правы чалавека, такія як права на свабоду ад дыскрымінацыі, права на асабістае і сямейнае жыццё (абмежаванне і стыгматызацыя асабістых аспектаў жыцця, такіх як сексуальная арыентацыя); права на свабоду ад жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання (легітымізацыя і стыгматызацыя гомасексуальнасці, трансгендарнасці можа спрыяць гвалту); права на свабоду меркаванняў і самавыяўлення (забарона і асуджэнне пэўных асабістых адносінаў прыгнятаюць самавыяўленне, фармуючы пагрозу для права чалавека свабодна праяўляць сваю ідэнтычнасць і погляды); права на роўную абарону перад законам (стыгматызацыя пэўных групаў стварае перашкоды для іх абароны з боку закону і можа падрываць гарантыі справядлівага і роўнага абыходжання)[10]. Таксама варта адзначыць, што дадзеная рыторыка размывае межы паміж сур'ёзнымі злачынствамі і асабістымі аспектамі жыцця, ствараючы пагрозу для ўразлівых групаў насельніцтва.

Тэрмін «парнаграфія» быў таксама зменены. Згодна з абз. 4 п. 2 Пастановы №18, (парнаграфія — вульгарна-натуралістычная, агідна-цынічная, непрыстойная фіксацыя палавых зносінаў, самамэтавая, наўмысная дэманстрацыя большай часткай аголеных геніталій, антыэстэтычных сцэнаў

---

7 Артыкул 169 Крымінальнага кодэкса. Распусныя дзеянні
1. Распусныя дзеянні, здзейсненыя асобай, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту, у дачыненні да асобы, якая заведама не дасягнула 16-гадовага ўзросту, пры адсутнасці прыкметаў злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 166, 167 і 168 гэтага Кодэкса, – караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох гадоў.
2. Тыя ж дзеянні, здзейсненыя з ужываннем гвалту або з пагрозай яго ўжывання, або ў дачыненні да заведама малалетняга (малалетняй), або бацькамі, педагагічнымі супрацоўнікамі або іншымі асобамі, на якіх ускладзеныя абавязкі па выхаванні непаўналетняга, або асобай, якая раней здзейсніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам; ці артыкуламі 166-168 гэтага Кодэкса, – караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці гадоў.
https://etalonline.by/document/?regnum=HK9900275

8 Артыкул 3391. Жорсткае абыходжанне з жывёлай
1. Жорсткае абыходжанне з жывёлай, якое пацягнула яго гібель або калецтвы, здзейсненае з хуліганскіх, карыслівых або іншых ганебных памкненняў або ў прысутнасці заведама малалетняга, – караецца грамадскімі працамі ці штрафам, ці папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, ці арыштам.
2. Тое ж дзеянне, здзейсненае паўторна або групай асобаў, – караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.
https://etalonline.by/document/?regnum=HK9900275

9 Артыкул 347 Крымінальнага кодэкса. Здзек з трупа ці магілы
1. Здзек з трупа ці магілы, або выкраданне трупа, або выкраданне прадметаў, якія знаходзяцца ў пахаванні, – караюцца штрафам або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.
2. Тыя ж дзеянні, здзейсненыя ў дачыненні да брацкай магілы або магілы абаронцы Айчыны, – караюцца арыштам ці абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, ці пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.
https://etalonline.by/document/?regnum=HK9900275

10 Усеагульная дэкларацыя Правоў чалавека: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/declarations/declhr.shtml
Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/pactpol.shtml

палавога акту, сексуальных вычварэнстваў, *нетрадыцыйных палавых адносінаў і (або) палавых паводзінаў* [новаўвядзенні], замалёвак з натуры, якія не адпавядаюць маральным крытэрам, абражаюць гонар і годнасць асобы, ставячы яе на ўзровень праяваў жывёльных інстынктаў)[11].

У гэтым выпадку «нетрадыцыйныя палавыя адносіны» ўключаныя ў катэгорыю парнаграфічнага кантэнту, што відавочна звязвае ЛГБТК+ адносіны з «парушэннямі маральных нормаў» у інтэрпрэтацыі аўтараў пастановы. Такім чынам, «нетрадыцыйныя палавыя адносіны» ў пастанове прадстаўленыя не асобна, а як элемент агульнага негатыўнага апісання парнаграфічнага кантэнту.

Варта выдзеліць тэрмін «прапаганда парнаграфіі», у які змены не ўносіліся, аднак удакладніць яго важна. У заканадаўчым акце пазначана, што «прапаганда парнаграфіі» — гэта выпуск, тыражаванне, паказ, пракат, продаж, рэкламаванне і іншае распаўсюджванне парнаграфічнай прадукцыі»[12].

Такім чынам, на падставе вызначэння тэрміна «парнаграфія» ў Пастанове №18 і ўключэння ў яго «нетрадыцыйных палавых адносінаў», можна меркаваць, што пад вызначэнне «прапаганды парнаграфіі» можа трапляць любое публічнае выказванне ў падтрымку ЛГБТК+, уключаючы фільмы, мерапрыемствы, і нават заявы пра сваю прыналежнасць да супольнасці.

Паколькі ў Пастанове №18 ЛГБТК+ адносіны кваліфікуюцца як «нетрадыцыйныя палавыя адносіны» і ўключаныя ў катэгорыю «парнаграфічнага зместу», любыя дзеянні, звязаныя з распаўсюджваннем інфармацыі пра ЛГБТК+, могуць разглядацца як «прапаганда парнаграфіі». Гэта можа ўключаць здымкі фільмаў (напрыклад, дакументальны фільм пра жыццё гомасексуальнай жанчыны), правядзенне мерапрыемстваў або публічныя заявы, што ўяўляе значную пагрозу для свабоды слова і выказвання меркавання па гэтых пытаннях.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што публічная падтрымка або абмеркаванне ЛГБТК+ тэмаў згодна з Пастановай №18 можа тлумачыцца як «прапаганда парнаграфіі» і, такім чынам, трапляць пад крымінальны пераслед (ніжэй змешчаны прыклады ўзбуджэння крымінальных артыкулаў, якія мы звязваем з прынятай Пастановай №18).

Звернемся да пакарання за выраб, захоўванне, распаўсюд парнаграфіі. Згодна з арт. 343 Крымінальнага кодэкса, выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару караецца грамадскімі працамі або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да

11 У рэд. пастановы Мінкультуры ад 19.03.2024 N 24 – https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441365
12 абзац 12 п. 2 Пастановы № 18.

двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін[13].

Гэтыя заканадаўчыя і прапагандысцкія меры прыводзяць да сур'ёзных сацыяльных і прававых наступстваў для ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі. Найперш узмацняецца стыгматызацыя і нянавісць да ЛГБТК+, што павялічвае рызыку гвалту на аснове гендарнай ідэнтычнасці і сексуальнай арыентацыі. Увядзенне адміністрацыйнай адказнасці за «прапаганду нетрадыцыйных адносінаў» і адмову ад нараджэння дзяцей ставіць асабістыя рашэнні людзей пад кантроль дзяржавы, парушаючы іх правы на недатыкальнасць прыватнага жыцця, свабоду самавыяўлення і абарону ад дыскрымінацыі.

З прычыны вышэйсказанага варта адзначыць, што дзяржава хоць і наўпрост не ўвяла закон пра забарону прапаганды, але зрабіла гэта ўскосна, завуалявана. Калі прама не паказваецца «прапаганда ЛГБТК+», а прыраўноўваецца да іншых злачынстваў. Ніжэй прыводзіцца інфармацыя пра пачатак дзеяння гэтага акта, калі ў дачыненні да прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці распачынаюцца крымінальныя справы пра «парнаграфію».

Такім чынам, новыя заканадаўчыя ініцыятывы ствараюць клімат страху і нецярпімасці, што з'яўляецца парушэннем міжнародных абавязкаў Беларусі ў сферы правоў чалавека. На думку экспертаў і экспертак, беларускія сілавікі ўжо актыўна выкарыстоўваюць Пастанову №18, каб заводзіць крымінальныя справы па артыкулах аб вырабе і распаўсюдзе парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару (артыкул 343 Крымінальнага кодэкса). Хоць сама Пастанова яшчэ не з'яўляецца законам, але стварае моцную аснову для рэпрэсій супраць ЛГБТК+ супольнасці.

---

13 Артыкул 343. Выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару
1. Захоўванне з мэтай распаўсюду ці рэкламавання або распаўсюд, рэкламаванне парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, малюнкаў, кіна-, відэафільмаў ці сцэнаў парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, здзейсненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, а таксама выраб з мэтай распаўсюду ці рэкламавання або трансляцыя ці публічная дэманстрацыя парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, малюнкаў, кіна-, відэафільмаў ці сцэнаў парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару – караюцца грамадскімі працамі або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.
2. Выраб ці захоўванне з мэтай распаўсюду ці рэкламавання або распаўсюд, рэкламаванне, трансляцыя або публічная дэманстрацыя парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, малюнкаў, кіна-, відэафільмаў ці сцэнаў парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, здзейсненыя з карыслівых меркаванняў або арганізаванай групай, а таксама распаўсюд, рэкламаванне, трансляцыя ці дэманстрацыя заведама непаўналетняму парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, малюнкаў, кіна-, відэафільмаў ці сцэнаў парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, здзейсненыя асобай, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту, – караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да чатырох гадоў ці пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.
https://etalonline.by/document/?regnum=HK9900275

# Прыклады рэпрэсій за апошні час

Па ўсёй краіне прайшоў шэраг рэпрэсіўных актыўных дзеянняў, накіраваных на ЛГБТК+, вось некаторыя з іх:

1. Вясной 2023 года Міністэрства інфармацыі разаслала 500 лістоў-папярэджанняў выдаўцам і кнігарням пра тое, што да іх будуць ўжытыя «меры адміністрацыйнага ўздзеяння», калі «ЛГБТ+ літаратуру знойдуць у продажы»[14].

2. У ліпені 2023 года два гомасексуальныя мужчыны былі затрыманыя па палітычных матывах і прымушаныя зняцца ў відэа, якое зневажае гонар і годнасць асобы, зазналі псіхалагічны і фізічны гвалт[15].

3. У кастрычніку 2023 года ў мінскіх клубах прайшлі аблавы са службовымі сабакамі, у выніку якіх сілавікі атрымалі доступ да асабістай перапіскі наведвальнікаў. Гэты метад гадамі выкарыстоўваецца ў Беларусі для стварэння так званых «базаў ЛГБТК+» на падставе ілжэнавуковых тэорыяў «прафілявання», калі цэлая сацыяльная група па змаўчанні прызнаецца сацыяльна-небяспечнай[16].

4. На дзяржаўным канале беларускага тэлебачання ў ліпені 2023 года выйшаў выпуск моладзевага ток-шоу «Да, но», дзе ЛГБТК+ ідэнтычнасць прыраўноўвалася да педафіліі, а ЛГБТК+ культура адлюстроўвалася як «зброя Захада». Гэты праект быў створаны і прафінансаваны Нацыянальным сходам Беларусі для «сацыяльнай прафілактыкі», мэтай якой з'яўляецца запалохванне ЛГБТК+ людзей, прымушаючы іх хаваць сваю ідэнтычнасць ці пакідаць краіну[17].

5. Дэпутат Мікалай Бузін у жніўні 2024 года апублікаваў у газеце «Беларусь сегодня»[18] артыкул пра тое, як ЛГБТК+ рух з'яўляецца «штучна выкліканай сацыяльнай эпідэміяй», а квір-людзі «рэалізуюць у Беларусі План Далеса пад кіраўніцтвам Рымскага клуба»[19].

---

14 «Мы ўжо прынялі дастатковыя меры, каб распаўсюджванне такой прадукцыі ў нашай краіне было абмежаванае, – сказаў Уладзімір Перцаў. – Пры тым, што ў нас няма як такога закону аб забароне прапаганды ЛГБТ+, змены полу і іншых праяваў. Напэўна, тут у комплексе трэба падысці да распрацоўкі такога законапраекта, і важную, ключавую ролю павінны адыграць заканадаўцы, сцягнуўшы да сябе розныя міністэрствы і ведамствы, каб гэта быў сапраўды комплексны, шырокі і працаздольны прававы акт. Мы са свайго боку будзем не тое што чакаць выконваць ужо апублікаваны заканадаўчы акт, які атрымаў моцу, мы працягваем гэтую працу. У нас ёсць пэўныя інструменты. Расійскія калегі, у якіх ёсць такі закон, пацвярджаюць, што мы без закона нават дзесьці больш эфектыўна, чым яны, працуем». – https://www.tvr.by/news/obshchestvo/pertsov_belarus_effektivno_boretsya_s_propagandoy_netraditsionnykh_tsennostey/

15 https://t.me/belsat/104218

16 https://gpress.info/2023/10/09/v-minskih-gey-klubah-proshli-reydy-silovikov/

17 https://www.youtube.com/watch?v=TqPtRrcU3kA

18 Важна адзначыць, што «Беларусь сегодня» з'яўляецца галоўным дзяржаўным друкаваным медыя краіны. Заснавальнікам газеты з'яўляецца Адміністрацыя прэзідэнта, а сам аўтар артыкула – старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека і СМІ.

19 https://www.sb.by/articles/nenormalnaya-normalnost.html

**Пры гэтым варта адзначыць, што сітуацыя ў дачыненні да ЛГБТК+ пагаршаецца з кожным годам ва ўсіх сферах жыцця.** Так, паводле дадзеных праекта «Журналісты за талерантнасць», сёння Беларусь перажывае рэкордны пік мовы варожасці. Сітуацыя з рэпрэзентацыяй ЛГБТК-супольнасці ў беларускіх медыя застаецца небяспечнай. Да каранавіруса толькі кожная 25-я публікацыя на дадзеную тэму падтрымлівала ўстаноўкі, якія стыгматызуюць або дыскрымінуюць ЛГБТ-людзей. Пасля пачатку першай хвалі ўжо кожная сёмая публікацыя па тэме змяшчала праявы мовы варожасці; пасля пачатку палітычнага крызісу — кожная пятая; у 2021 — кожная чацвёртая, а ў 2022 і 2023 — амаль кожная другая[20].

Шэраг экспертаў і экспертак выказваюць заклапочанасць гэтым фактам, сцвярджаючы, што гэта ставіць пад удар найбольш уразлівыя групы ўнутры ЛГБТК+ супольнасці: транс-персон, квір-падлеткаў, ЛГБТК+ людзей, якія жывуць з ВІЧ, квір-бацькоў, ЛГБТК+ людзей з інваліднасцю і/або ментальнымі асаблівасцямі. Атмасфера страху, недаверу і татальнай небяспекі перашкаджае ЛГБТК+ людзям звяртацца па дапамогу ў сітуацыях гвалту, а сталая мова варожасці з боку прапаганды рэжыму нармалізуе дыскрымінацыю ў вачах квір-персонаў. Шэраг арганізацыяў сцвярджаюць, што такая палітыка асабліва моцна ўплывае на маладых прадстаўнікоў ЛГБТК+, якія ўжо 4 гады жывуць ва ўмовах штучна створанай рэжымам «стэрыльнай» прасторы, расійскага парадку дня і пастаяннай трансляцыі мовы варожасці.

З прычыны сітуацыі, якая пастаянна пагаршаецца, беларуская арганізацыя дапамогі транс-людзям TG-House (ТГ-Хаўс) у жніўні 2024 года запусціла петыцыю за спыненне рэпрэсіяў у дачыненні да ЛГБТК+ людзей і агрэсіўнай маргіналізацыі транс-персонаў[21].

## Рэпрэсіі ў дачыненні да транс-супольнасці

Мы вырашылі вылучыць у асобны блок рэпрэсіі ў дачыненні да транс-супольнасці, паколькі на сённяшні дзень узровень рэпрэсіяў павялічыўся у дзясяткі разоў. За апошнія гады трансгендарныя людзі сталі адной з самых уразлівых групаў унутры ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі. Узмацненне стыгматызацыі на заканадаўчым узроўні, масавыя адмовы камісій па гендарным пераходзе, перабоі з доступам да гарманальнай тэрапіі, прымусовыя шпіталізацыі і зневажальныя ўмовы медыцынскіх

20 Маніторынг мовы варожасці ў дачыненні да ЛГБТК+ у СМІ Беларусі ў 2023 годзе: https://j4t.info/2023/12/29/monitoring-yazyika-vrazhdyi-v-otnoshenii-lgbtk-v-smi-belarusi-v-2023-godu/
21 https://action.allout.org/en/m/7e534af6/

працэдураў сталі часткай сістэматычнай палітыкі ціску. Рэпрэсіі ўключаюць таксама пагрозы пазбаўлення бацькоўскіх правоў, незаконныя патрабаванні здачы ДНК, а таксама арышты і катаванні. Важным сігналам стала значнае павелічэнне адмоваў на камісіях па гендарным пераходзе і відавочная сінхранізацыя беларускай палітыкі з расійскімі анты-ЛГБТК+ мерамі. Транс-людзей масава пазбаўляюць магчымасці легальных аперацыяў, падвяргаюць гвалту і пастаянным эмацыйным і псіхічным траўмам.

Ніжэй мы прыводзім інфармацыю, заснаваную на дадзеных ад профільных праваабарончых арганізацый, якія ілюструюць рэальнае становішча трансгендарных людзей.

Яскравым прыкладам палітыкі рэжыму па стыгматызацыі ЛГБТК+ на заканадаўчым узроўні з'яўляецца гісторыя трансгендарнай актывісткі, якую некалькі разоў арыштоўвалі за палітычныя погляды. Пасля эвакуацыі з Беларусі яна распавяла пра ўжытыя да яе катаванні[22]. Таксама, у чэрвені 2023 года трансгендарная жанчына была збітая ў Мінску на вуліцы за значкі з вясёлкавым і ўкраінскім сцягамі[23], а пасля звароту ў праваахоўныя органы была арыштаваная «за пратэстную дзейнасць»[24].

Паводле звестак арганізацыі TG-House, восенню 2024 года былі праведзеныя «рэйды» сярод транс-персонаў у Беларусі. У 2023 — 2024 годзе зафіксаваныя шматлікія выпадкі пераследу трансгендарных людзей. Ніжэй прыводзім некаторыя з іх:

1. Першы выпадак адбыўся ў канцы 2023-га — пачатку 2024-га года з трансгендарным мужчынам у Мінску, які юрыдычна зрабіў аперацыю і абнавіў дакументы. Але пазней ён сутыкнуўся з ціскам з боку дзяржаўных органаў, якія патрабавалі вярнуць папярэднія дакументы. Таксама былі здзейсненыя спробы пазбавіць яго бацькоўскіх правоў (мужчына з'яўляецца шматдзетным бацькам, у яго чацвёра дзяцей).

2. Другі выпадак тычыцца транс-жанчыны з абласнога горада, якая была вымушаная эміграваць. 30 лістапада 2023 года і 22 лютага 2024 года яна падвяргалася прыніжэнням і пагрозам падчас падачы дакументаў з-за гендарнага пераходу, а 24 красавіка 2024 года ёй сталі паступаць званкі з патрабаваннямі з'явіцца ў пашпартны стол, якія суправаджаліся пагрозамі арышту.

3. Яшчэ адзін выпадак здарыўся ў верасні 2024 года. Транс-жанчына і яе партнёр былі затрыманыя па абвінавачванні ў захоўванні экстрэмісцкіх

22 https://www.tbelarus.com/post/t-belaruska-podrobnosti-pytok
23 https://t.me/viasna96/19811
24 https://t.me/viasna96/19837

матэрыялаў. Падчас затрымання яе збілі і псіхалагічна гвалцілі на падставе гендарнай ідэнтычнасці, а пасля прымусілі падпісаць пратакол, у якім быў пазначаны артыкул 343 КК Беларусі (выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару).

4. У верасні 2024 года ў адным з абласных гарадоў Беларусі транс-жанчыну выклікалі ў дэканат навучальнай установы падчас лекцыі і затрымалі за распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў. Яе таксама зневажалі на падставе гендарнай ідэнтычнасці і пагражалі гвалтам. У выніку аштрафавалі на 10 базавых велічыняў. Пераслед быў ініцыяваны ўніверсітэтам і падтрыманы сілавымі органамі.

5. Таксама ў верасні 2024 года ў невялікім горадзе транс-мужчына, які працаваў настаўнікам, быў затрыманы без тлумачэння прычынаў і трапіў пад прыніжэнні праз свой гендарны пераход. Пратакол не змяшчаў іншых доказаў апроч яго гендарнай ідэнтычнасці. Пазней пад ціскам пракуратуры мужчыну звольнілі са школы.

6. Яшчэ адзін інцыдэнт адбыўся ў верасні 2024 года ў невялікім горадзе, дзе тры транс-жанчыны трапілі падператрус і збіццё. Як мінімум, адну з іх абвінавацілі ў распаўсюджванні парнаграфічных матэрыялаў. У дачыненні да яе была распачатая справа па артыкуле 343 Крымінальнага кодэкса.

7. Сёмы выпадак адбыўся таксама ў верасні 2024 года. Была затрыманая транс-жанчына, якая таксама зазнала гвалт на вуліцы.

Такім чынам, можна зрабіць выснову пра тое, што прыняцце зменаў у Пастанову нумар №18 стала падставай для масавых затрыманняў, звальненняў і ўжывання катаванняў да ЛГБТК+ супольнасці, асабліва да прадстаўнікоў транс-супольнасці.

Арганізацыя TG-House таксама адзначае, што з пачаткам поўнамаштабнай вайны ва Украіне даступнасць гарманальнай тэрапіі рэзка знізілася, а кошты на прэпараты значна павялічыліся. На дадзены момант сітуацыя яшчэ больш пагаршаецца ў сувязі з падзеннем узроўню жыцця. Асабліва моцна гэта адбіваецца на трансгендарных і небінарных людзях, якія ўжо знаходзяцца ў групе рызыкі. Юрыдычная працэдура засталася ранейшай, як і гадамі раней: трансгендарныя людзі праходзяць працяглы працэс, уключаючы рэгулярныя візіты да сексолага, двухтыднёвую шпіталізацыю і разгляд справы міжведамаснай камісіяй[25]. Аднак адсотак адмоваў камісіі з 2024 года павялічыўся ў разы. Так, па ацэнках беларускіх ініцыятываў па абароне правоў транссексуалаў, калі раней

25 https://www.transcoalition.net/trans-and-nonbinary-people-in-belarus-2022/

адсотак адмоваў складаў 10-15% (2-3 адмовы на 20 запытаў), то сёння гэты паказчык даходзіць да 80%. У траўні 2024 года камісія адмовіла 15 з 20 заяўні_цаў[26].

Нягледзячы на тое, што дзяржава намінальна надае бясплатную гарманальную тэрапію, трансгендарныя людзі маюць права пачаць яе толькі пасля атрымання дазволу камісіі (тэрміны правядзення камісій пры гэтым зацягваюцца і могуць даходзіць да 1,5 года). Пры гэтым дазвол камісіі шмат у чым базуецца на адпаведнасці знешнасці жаданаму полу (напрыклад, на ўзроўні фемінізацыі для трансгендарных жанчын). Праз бюракратызацыю працэдуры і нізкі адсотак станоўчых рашэнняў многія трансгендарныя людзі пачынаюць тэрапію нелегальна і на свае страх і рызыку. Калі раней у сярэднім на камісію прыходзіла каля 20-25 человек, то на снежаньскую камісію чакаецца каля 50 чалавек. На дадзены момант на ўліку па трансгендарным пераходзе ў Беларусі стаяць каля 450 чалавек, хаця афіцыйнай інфармацыі па гэтым пытанні не даецца[27].

Паводле меркавання профільнай арганізацыі, трансгендарныя людзі асабліва падпадаюць пад рэпрэсіі, паколькі іх ідэнтычнасць схаваць практычна немагчыма (*напрыклад, у пашпарце ідэнтыфікацыйны нумар змяшчае дадзеныя пра гендар, прыпісаны па нараджэнні. Нават пасля змены полу гэтыя дадзеныя застаюцца нязменнымі*). Патрыярхальныя структуры бачаць у трансгендарнасці пагрозу сваёй аснове — выразнаму падзелу гендара, што робіць транс-супольнасць найбольш уразлівай.

## Стан ЛГБТК+ супольнасці, заснаваны на дадзеных ад прадстаўнікоў і прадстаўніц профільных арганізацый

Пасля зменаў у заканадаўстве ЛГБТК+ супольнасць сутыкнулася з яшчэ большым ціскам. Цяпер асабістыя перапіскі і знаёмствы могуць тлумачыцца як парнаграфія, што з'яўляецца парушэннем права на неўмяшанне ў прыватнае жыццё і выклікае дадатковы страх.

Сітуацыя для ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі рэзка пагоршылася пасля 2020 года, што стала следствам палітычных рэпрэсіяў і ўзмацненнем

26 Пытанні на камісіі задаваліся стандартныя: ці збіраецеся рабіць аперацыі, якія адносіны з бацькамі, сябрамі, ці ёсць праца, ці ёсць/ці быў партнёр, у якую прыбіральню ходзіце, якому імю аддаеце перавагу і г.д. Акцэнт рабіўся на адпаведнасці знешнасці транс-персоны жаданаму гендару і магчымасці сацыялізацыі. https://www.tbelarus.com/post/komissija2024-1-otkazy

27 Паводле інфармацыі праваабарончай арганізацыяй, якая працуе з правамі транс-людзей – TG-House.

жорсткасці заканадаўства. Раней даступныя мерапрыемствы, сустрэчы і знаёмствы змяніліся страхам перад сілавікамі, якія мэтанакіравана пераследуюць прадстаўнікоў і прадстаўніц супольнасці, выкарыстоўваючы расплывістыя абвінавачванні ў экстрэмізме, хуліганстве або распаўсюджванні парнаграфіі. Асабістыя камунікацыі і знаёмствы сталі небяспечнымі, асабліва ў інтэрнеце, што ўзмацняе пачуццё ізаляцыі і безабароннасці.

Паводле словаў адн:ой эксперт:кі, да 2020 года можна было сказаць, што разгалінаваная сетка арганізацыяў грамадзянскай супольнасці забяспечвала ЛГБТК+ разнастайнасць культурнага жыцця і доступ да камунікацыі, нефармальнай адукацыі і рэкрэацыі. Зараз жа страх перад анлайн-знаёмствамі стаў значна большым. Эксперты і эксперткі адзначаюць, што розніца ў адносінах з боку сілавікоў да ЛГБТК+ супольнасці ўжо была заўважная падчас маніторынгу ў 2020 годзе, аднак тады затрыманні адбываліся па палітычных матывах. Цяпер стала відавочна, што прадстаў:ніц ЛГБТК+ затрымліваюць менавіта за прыналежнасць да супольнасці. Сілавікі маскіруюць свае дзеянні пад артыкулы пра «хуліганства» ці «экстрэмізм», але рэальныя прычыны звязаныя з сексуальнай арыентацыяй і (або) гендарнай ідэнтычнасцю затрыманых. Хочам адзначыць, што ўжо пачалося ўзбуджэнне крымінальных справаў па арт. 343 Крымінальнага кодэкса (выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару).

Ні для кога не сакрэт, што на сайтах знаёмстваў існуе рызыка сустрэць прадстаўніка сілавых структураў. Цяпер гэтая рызыка павялічылася ў разы. Людзі ўсё часцей аддаюць перавагу размове толькі праз правераных знаёмых або зусім пазбягаюць новых кантактаў. Паняцце «прыватнае жыццё» стала вельмі адносным, паколькі ціск з боку рэжыму і схільнага да прапаганды грамадства пранікае ў самыя асабістыя сферы жыцця людзей. Страх перад дыскрымінацыяй, рэпрэсіямі і гвалтам стаў паўсядзённасцю ЛГБТК+ супольнасці.

Пасля 2022 года ўзровень агрэсіі і гвалту з боку сілавікоў узрос. У працэсе вобшукаў яны пачалі яшчэ больш масава ўжываць прыніжальныя дзеянні: секс-цацкі выкарыстоўваюцца ў абразлівых мэтах, здымаюцца відэа, ствараючы тым самым кантэнт, які можна назваць гвалтоўным і сексуалізаваным.

Узнікаюць «новыя» формы пагрозаў, якія становяцца «трэндам». Калі затрыманы з'яўляецца прадстаў:ніцай ЛГБТК+ супольнасці, іх асабістыя перапіскі супрацоўнікі сілавых структураў пачынаюць трактаваць як палітычна небяспечныя. Такім чынам, сяброўскі чат на 3-5-7-10 людзей можа ўспрымацца як крымінальнае злачынства, асабліва, калі ў чаце прысутнічаюць прадстаўнікі ЛГБТК+ супольнасці. Варта адзначыць, што

пры затрыманнях,ператрусах і допытах ЛГБТК+ людзям пагражаюць завядзеннем справы па артыкуле аб педафіліі, а таксама гвалтам, як з боку сілавікоў, так і «будучых сукамернікаў/іц».

Прапаганда ўзмацняе гэтыя настроі, транслюючы на дзяржаўных каналах інфармацыю пра «змову педафілаў» і іншыя тэорыі змовы.

Пры гэтым прапаганда рэжыму часта выкарыстоўвае вобразы ЛГБТК-людзей для легітымізацыі ціску на актыўных грамадзян_ак: у дзяржаўнай прэсе і на тэлебачанні працягваюць выходзіць матэрыялы, якія звязваюць ЛГБТК-супольнасць з пратэстамі, а пратэсты — з уплывам заходніх краінаў.

Такім чынам, ціску на ЛГБТК+ супольнасць у Беларусі перайшоў са сферы палітычнага пераследу ў адкрытую кампанію па прыцісненні і знішчэнні любой праявы гендарнай і сексуальнай разнастайнасці з поўным ухваленнем рэжыму.

**Асабліва ўразлівай групай застаюцца непаўнагадовыя прадстаўнікі ЛГБТК+ супольнасці.** Праблемы падлеткаў застаюцца нябачнымі, а падтрымка практычна адсутнічае. Замкнёнасць, адзінота і страх сярод падлеткаў значна мацнейшыя, чым у дарослых. Гэта павялічвае рызыку самапашкоджанняў (сэлфхарм) і суіцыдальных настрояў сярод непаўнагадовых.

Варта ўзгадаць пра нядаўнюю статыстыку суіцыдаў у Беларусі: Генеральная пракуратура Беларусі заявіла, што ў першай палове 2024 года колькасць суіцыдаў сярод непаўнагадовых павялічылася на 50%. Аднак гэтыя прычыны застаюцца павярхоўнымі і не адлюстроўваюць агульны ўзровень стрэсу і трывогі ў грамадстве. Так, напрыклад, прама не ўзгадваюцца такія ключавыя фактары, як рэпрэсіі: у турмах знаходзіцца больш за 1 300 палітвязняў, а па агульнай статыстыцы праваабарончага цэнтра «Вясна», пачынаючы з 2020 года было затрымана 65 000 чалавек. За гэты ж перыяд зафіксавана больш за 74 тысячы фактаў рэпрэсіяў, у тым ліку вобшукі, кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя затрыманні, допыты і іншыя формы ціску[28].

Акрамя таго, у школах узмацняецца ідэалагізацыя сферы адукацыі, што стварае дадатковы ціск на дзяцей і падлеткаў, асабліва на тых, хто не адпавядае афіцыйным ідэалагічным устаноўкам[29].

28 https://spring96.org/ru/news/115957

29 37,7% апытаных беларускіх школьнікаў адказалі, што настаўнікі расказвалі ім на ўроках, як «правільна» ставіцца да расійскага ўварвання ва Украіну. Таксама сярод адказаў былі наступныя фармулёўкі: «прыходзіў пракурор і праводзіў урок», «прыязджалі прадстаўнікі адміністрацыі і казалі пра тое, што будзе, калі дзеці не пойдуць на праўладны мітынг. Узгадвалі смяротнае пакаранне». Рэгулярна праводзяць школьныя гутаркі і прадстаўнікі праваслаўнай царквы з ключавым пасылам, што супраціў дзяржаўнай уладзе – грэх. https://www.svoboda.org/a/prihodil-prokuror-provodil-urok-shkolniki-v-belarusi-vernulis-v-sssr/32029749.html

Можна меркаваць, што рэпрэсіўная палітыка ўсё больш уплывае на непаўнагадовых, а таксама стварае невыносныя ўмовы для жыцця і развіцця.

Важна адзначыць, што тыя праблемы, якія былі да 2020 года, захаваліся. Так, напрыклад, непрыняцце бацькамі іх дзяцей пасля камін-аўту часта прыводзіць да таго, што моладзь знаходзіцца на вуліцы. У профільныя арганізацыі непаўнагадовыя сталі звяртацца па дапамогу значна радзей, іх асноўныя праблемы звязаныя з адносінамі з бацькамі і праходжаннем камісіяў.

Такім чынам, пасля ўвядзення новага дыскрымінацыйнага заканадаўства прыватнае жыццё ЛГБТК+ людзей у Беларусі ператварылася ў прастору страху, няўпэўненасці і пастаянных рызыкаў.

## Уплыў расійскай прапаганды на ЛГБТК+ супольнасць у Беларусі

Асобна трэба вылучыць уплыў расійскай прапаганды на беларускую супольнасць. Эксперт:кі адзначаюць, што як сілавікі, так і некаторыя прадстаў:нікі ЛГБТК+ супольнасці ўпэўненыя ў тым, што ў Беларусі прыняты закон супраць прапаганды. Прыкладам можа паслужыць выпадак з В., якой наўпрост казалі, што «калі ў Расіі забаронена, значыць, гэта павінна быць забаронена і ў Беларусі»[30]. Яшчэ адным пацверджаннем могуць быць словы Наталлі Качанавай пра тое, што варта арыентавацца на расійскую практыку[31].

## Псіхалагічны стан ЛГБТК+ супольнасці пасля 2020 года

З 2020 года колькасць запытаў у профільныя арганізацыі на псіхалагічную падтрымку значна павялічылася, асабліва па пытаннях трывожнасці і дэпрэсіўных эпізодаў. Часцяком з'яўляюцца запыты на дапамогу ў падрыхтоўцы да магчымых сітуацыяў (затрыманне, арышт, катаванні).

30 Паводле дадзеных праваабарончай арганізацыяй, якая працуе з правамі транс-людзей – TG-House.

31 «Калі я была з афіцыйным візітам у Маскве, аккурат у той дзень у Дзяржаўнай думе прынялі закон пра забарону прапаганды ЛГБТ. Напэўна, давядзецца прымаць і нам. І гэта будзе правільна. Нельга гэта прапагандаваць. У нас ёсць сямейныя каштоўнасці, традыцыі, якія мы перадаем з пакалення ў пакаленне: традыцыі сям'і, праваслаўя». – https://belta.by/society/view/zakon-o-zaprete-propagandy-lgbt-mozhet-pojavitsja-v-belarusi-542513-2022/

Таксама пасля публічнага ўвядзення Пастановы №18 прыватнае жыццё прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі істотна пагоршылася. Людзі сутыкаюцца з небяспекай і непрадказальнасцю новых знаёмстваў, паколькі павялічыліся выпадкі правакацыяў з боку сілавікоў. Адзіноцтва становіцца ўсё больш распаўсюджаным, а страх і ціск прымушаюць некаторых узнаўляць абʼюзіўныя стасункі з былымі партнёрамі, нягледзячы на досвед хатняга гвалту.

Адначасова праваабарончыя арганізацыі папярэджваюць пра магчымае ўзмацненне сацыяльнай ізаляцыі і ўразлівасці ЛГБТК+. У сваёй заяве ад 4 ліпеня 2023 года яны патрабуюць прытрымлівацца міжнародных абавязкаў Беларусі ў сферы сексуальных і рэпрадуктыўных правоў[32].

Абмежаванне доступу да інфармацыі пра сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць, асабліва сярод моладзі, вядзе да маргіналізацыі і паглыблення псіхалагічных праблемаў, а таксама да павышэння ўзроўня рызыковых сексуальных паводзінаў і, як вынік, да рызыкі павелічэння распаўсюджвання ІППШ і ВІЧ. Супрацьстаянне ЛГБТК+ пазіцыянуецца як абарона традыцыйных каштоўнасцяў, што спрыяе фармаванню агрэсіўных настрояў у грамадстве і пагаршае становішча ўразлівых групаў.

Таксама павялічылася колькасць запытаў на эвакуацыю, асабліва ў канцы 2023 і пачатку 2024 года, з прычыны таго, што ўзровень рэпрэсіяў увесь час расце.

Паводле словаў спецыяліста:к, многія людзі адчуваюць моцнае жаданне эміграваць, але праз сітуацыю, якая пастаянна пагаршаецца, ім не хапае рэсурсаў. Важна таксама адзначыць другі аспект: калі цысгендарныя гетэрасексуальныя людзі могуць адносна лёгка эміграваць у такія краіны як Польшча, Літва ці Грузія (самыя «папулярныя» краіны), то для нецысгендарных і негетэрасексуальных людзей гэта значна складаней. Краінаў з нізкім узроўнем гамафобіі значна менш, і перспектыва пераезду з аднаго гамафобнага грамадства ў іншае, такое ж варожае, нярэдка спыняе.

Паводле меркавання эксперт:а, перад людзьмі стаіць «выбар без выбару»: як у Беларусі, так і ў іншых «блізкіх» краінах захоўваецца высокі ўзровень гамафобіі і страху.

Варта адзначыць, што, пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання ва Украіну (24 лютага 2022 г.) узмацніўся гвалт у дачыненні да трансгендарных людзей, што стала магчымым, дзякуючы «легалізацыі» гвалту рэжымам. Цяпер гвалт становіцца адкрытым, і ён распаўсюджваецца на шматлікіх прадстаўнікоў і прадстаўніц супольнасці. Сілавікі і прыхільнікі прапаганды пачынаюць лічыць такія дзеянні апраўданымі, што вядзе да нармалізацыі сацыяльнай няроўнасці.

32 https://spring96.org/ru/news/112101

# Напрыканцы

Справаздача выяўляе нарастаючы ціск і рэпрэсіі ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі. У апошнія гады рэжым робіць актыўныя крокі па прыцісненні гендарнай і сексуальнай разнастайнасці, выкарыстоўваючы юрыдычныя інструменты і прапаганду для дыскрэдытацыі ЛГБТК+ людзей.

Увядзенне Пастановы №18, якая прыраўноўвае абмеркаванне ЛГБТК+ тэматыкі да парнаграфіі, фактычна забараняе любыя пазітыўныя ці нейтральныя згадкі ЛГБТК+ у грамадскай прасторы. Гэта стварае прававую аснову для пераследу людзей за выражэнне іх сексуальнай арыентацыі або гендарнай ідэнтычнасці, што можна трактаваць як форму заканадаўчага замацавання дыскрымінацыі.

Дзяржаўная прапаганда актыўна выкарыстоўвае рыторыку абароны дзяцей і барацьбы з педафіліяй для таго, каб дыскрэдытаваць ЛГБТК+ супольнасць. Гэта стварае ілжывую асацыяцыю паміж ЛГБТК+ людзьмі і злачыннымі дзеяннямі, такімі як педафілія, некрафілія, заафілія, што ўзмацняе прадузятасць і нармалізацыю гвалту ў дачыненні да ЛГБТК+ з боку грамадства. Гэтая рыторыка дапамагае фармаваць успрыманне гвалту як апраўданага і дапушчальнага ў барацьбе за «традыцыйныя каштоўнасці». Важна адзначыць, што ўжо існуе практыка завядзення крымінальных справаў на аснове гэтых нормаў, калі ў дачыненні да ЛГБТК+ распачынаюцца крымінальныя справы па арт. 343 Крымінальнага кодэкса аб вырабе і распаўсюджванні парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару. Эксперт:кі лічаць, што колькасць крымінальных справаў па дадзеным артыкуле будзе толькі расці.

У выніку, нягледзячы на тое, што законы хоць і не легалізуюць гвалт, але ж ствараюць прававыя і сацыяльныя ўмовы, якія спрыяюць рэпрэсіям, дыскрымінацыі і гвалту ў дачыненні да прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці.



2024